18.00 «Наследство Афродиты». Телесериал (Великобритания—Кипр).
19.00 «Момент истины». Авторская программа А.Караулова.
19.55 Прогноз погоды.
20.00 Премьера ТВЦ. «Плащаница Александра Невского». Детектив.
22.40 Спортивный экспресс.
23.15 Сенсации и не только в программе «Деликатесы».
23.45 Золотая фишка.
0.40 Худ. фильм «Вся жизнь» (Франция—Италия).

• SEX-ликбез

Не "залетай"!

Статистика утверждает, что белорусы — нация вымирающая. В то же время по числу абортов на каждую 1000 новорожденных мы чуть ли ни впереди планеты всей. Почему женщины не хотят рожать — это тема для дискуссий экономистов, медиков, социологов. А вот почему лучшим средством для предохранения от нежелательной беременности белорусские женщины выбирают аборт — обсуждать нам. И решать: стоит ли так распоряжаться собственным здоровьем.

Процент использования современных способов контрацепции в Беларуси не превышает 30. Главный аргумент не использования контрацептивов — их дороговизна. Действительно, не каждая семья способна выкраивать из своего скудного бюджета 5-8 долларов ежемесячно на приобретение таблеток далеко (на их взгляд) не первой необходимости. Потому большинство предпочитает полагаться на старый дедовский метод "авось пронесет". Когда же "не проносит", бегут к врачу — делать аборт. Мучаются от страха и боли, проклинают мужиков, клянутся, что больше "ни за что и никогда", зарабатывают целый букет осложнений и... И все остается, как прежде. До следующего "залета". Это замкнутый круг: так жили наши бабушки, так живут наши мамы, так будем жить и мы? Оставаясь дремучими в вопросах элементарной сексуальной грамотности, предпочитая маленькой таблетке "нож хирурга"? Не думая, какими финансовыми вложениями в наше здоровье аукнется "дешевая" операция, которая отнимет здоровье и у будущих детей?

Если они у вас, конечно, после всего этого смогут родиться.


Конечно, журналист — не медик, потому, чтобы наши доводы были более аргументированы, мы обратились к "женскому" врачу — акушеру-гинекологу Татьяне Чайкиной.

— Почему у нас так не популярны противозачаточные таблетки, мне не совсем понятно. Возможно, потому, что у многих до сих пор, как ни дико это прозвучит, существует страх перед таблетками-контрацептивами. Женщины боятся употреблять медицинские препараты, не посоветовавшись с врачом. А терять время, выстаивая в очереди, чтобы попасть на прием к врачу, не многие согласятся. К тому же среди наших женщин сформировано негативное отношение к противозачаточным таблеткам — мы пытаемся его переломить, но это достаточно сложно. Ну и, конечно, широкому распространению контрацептивов препятствует достаточно высокая цена на них.

В 25% случаев причиной материнской смертности является аборт. Но аборт, увы, — наиболее распространенное средство контроля рождаемости.

— Действительно, часто приходится слышать, что от противозачаточных таблеток полнеют, что они "провоцируют" усиленный рост волос...

— Все это чушь! Первое поколение этих таблеток, действительно, обладало побочными эффектами — и прибавку веса давали, и усиленный рост волос. Современные препараты очень низко дозированные, за счет этого все побочные эффекты сведены к минимуму. Прибавка в весе может быть только у тех женщин, которые имеют ярко выраженную склонность к полноте. Более того, современные контрацептивы способны защитить не только от нежелательной беременности — герсудные явления (повышенный рост волос, проблемная кожа) очень хорошо лечатся противозачаточными таблетками "Диане-35".



Использование в качестве контрацептивов противозачаточных таблеток — это еще и хороший профилактика раковых заболеваний женской половой сферы. Специалисты утверждают, что употребление в течение любых (!) полугода жизни этих препаратов чуть ли ни на 50 % снижает риск заболеть раком яичников. Кроме того — это постоянный менструальный цикл, минимальная кровопотеря. То есть положительных сторон у этих препаратов очень много.

— Когда женщина решает, какими противозачаточными таблетками ей пользоваться, достаточно ли просто изучить прилагаемую инструкцию или все-таки лучше посоветоваться с врачом?

— Лучше, конечно, поговорить с врачом. Специалисту иногда достаточно просто взглянуть на женщину, чтобы определить, какие препараты ей лучше подойдут: трехфазные или монофазные. Назначение того или иного препарата зависит от возраста женщины, ее комплекции, а, кроме того, курит женщина или нет.

Хотя большой беды не будет, если женщина сама что-то купит и попробует, а уж если какие-то проблемы возникнут, тогда можно прийти на консультацию.

— А очень юным леди — сейчас подростки довольно рано вступают в половую жизнь — чем лучше всего предохраняться: таблетками или все-таки презервативами?

— Мы рекомендуем двойное предохранение — презерватив и "Фарматекс". Идет двойная подстраховка, на случай, если презерватив "не сработает", порвется или соскочит. "Фарматекс" (а выпускается он в виде мази, свечей и вагинальных таблеток) не только предохраняет от беременности, но и от целого букета венерических болезней. Но... Таблетки все-таки не для 15-16-летних. Лучше всего начинать ими пользоваться с 18 лет, когда уже отладился менструальный цикл. И еще один момент — у девочки должен быть постоянный половой партнер, которому она полностью доверяет. Потому как таблетки, к сожалению, от венерических болезней не спасают. А вообще, я бы посоветовала девочкам отложить время вступления в половую жизнь настолько, на сколько это возможно. Уж, по крайней мере, не раньше 17! И эрозии шейки матки, и дисплазия — все это последствия ранней половой жизни. Недостаток знаний, недоступность контрацептивов и уязвимость девочек-подростков для насилия являются очень высоким риском для возникновения нежелательной беременности. Чем моложе девочки, тем чаще они делают аборты. Число абортов, производимых в подростковом возрасте в Беларуси, составляет 11-12 тыс. ежегодно. Достаточно большое число из них — криминальные.

Около половины всех женщин страдают от гинекологических расстройств, 70 % из которых могут быть связаны с последствиями абортов.

Министерство здравоохранения утверждает, что на 100 случаев рождения живых детей приходится 150 абортов.

Банальная истина: больная мать не может родить здоровое потомство. Уродуя свой организм безответственным отношением к себе любимой, мы обречены растить отнюдь не цветы жизни. Во многих европейских странах контрацептивы подросткам раздаются бесплатно. Там предпочитают действовать согласно принципу, что болезнь легче предупредить, чем излечить. А нежелательная беременность — это та же болезнь, раз избавляются от нее с помощью операции. Наше государство, несмотря на декларируемую заботу о репродуктивном здоровье нации, до таких "широких" жестов не доросло. Остается заботиться о себе самим. И первым шагом этой заботы должно стать понимание: нет ничего хуже, чем экономия на собственном здоровье.

Галя Пеля,
Слава Степянская, "БМ",
фото IREX/ProMedia

Белы Замак # 5

У пяты раз з 1 па 3 сакавіка ў мінскім Палацы дзяцей і моладзі (Старавіленскі тракт, 41) ладзіцца міжнародны фэст сярэднявечнай культуры і музыкі "Белы Замак".

Па традыцыі арганізатарам мерапрыемства выступае Ордэн Паўночнага Храма (Мінск) пры спонсарскай падтрымцы фірмы "Стальиндустрия", Інстытута Польскага і адзінай рыцарскай крамы "Бастыён".



У фэсце маюць намер узяць удзел ваяры, блазны, прыўкрасныя дамы з Беларусі, Польшчы, Расеі і Украіны. Прыезд Прыбалтыкі ў асобе Латвіі пад пытаннем. Экзатычна выглядае наяўнасць у складзе ўдзельнікаў клубу з рэспублікі ... Комі. Увогуле, гэты "Белы Замак" мае ўсе шанцы прайсці ў стылі настальжы. Праграма 2002 – клон мінулагодніх фэстаў. Да ўсяго рэаніміваная абарона "брамы замка" – спаборніцтвы ўзору імпрэзы'97. Выстава асаднай тэхнікі і конкурс даспехаў апрабаваныя ў мінулым сезоне. З паметкай "new" праходзіць толькі конкурс пастановачных паядынкаў – самае-самае відовішчнае.

За музычную частку адказнасць ускладаецца на "Старога Ольсу", гурты "Калі-Юга" са спецыяльнай акустычнай праграмай, "Інкогніта", добры дзесятак менестрэляў etc. Тэатральная праграма – спектакль па матывах французскай казкі "Выклеванае сэрца" з дзеткамі з светлагорскага тэатру ў галоўных ролях. І гэта далёка не ўсё. Каму не цярпіцца – загляніце на www.alterego.tut.by.

Арганізатары абяцаюць яшчэ шмат цікавых сюрпрызаў і нагадваюць, што "сярэдніх вякі чакаюць Вас, спадарства!".

Дар'я Сітнікава, для "БМ"

P.S. *Сустрэчы з сярэднявечам абыдуцца вам у 3000 рублёў штодня – кошт уваходнага квітка. Набыць квіткі загадзя можна непасрэдна ў Ордэне Паўночнага Храма. Кантакты: ordo@tut.by.*

Кому — радость, кому – грусть

День влюбленных не так давно начали отмечать в нашей стране. Может, потому, что праздник импортирован, и понимают его по-разному. Кто-то в этот день занимается политикой, кто-то любовью, кто-то просто пьет, как и в любой другой праздник...

ГРУСТНЫЙ ПРАЗДНИК

В коллективе, состоящем на восемьдесят процентов из женщин, половина дам была разведена. Но праздник... И дамы купили шампанского и шоколада. Выпили, поговорили о работе, начальнике, отсутствующих коллегах, о мужчинах, которые "все козлы", и стало очень грустно. Купили водки, еще поговорили и разошлись домой ближе к полуночи.

ПРАЗДНИК ЛЮБВИ

Они любили друг друга очень давно. Об этом догадывались все окружающие их люди. Они и сами это чувствовали, но "были пусты и хладны их краткие речи". Его кабинет располагался на пятом этаже, а ее — на четвертом. Проходя по четвертому этажу, он заметил, что у нее посетители. Она тоже нашла повод подняться на пятый этаж, но его не оказалось на месте...

Он размышлял, не послать ли ей письмо по электронной почте. Такое как бы шутливое, но напомнить, что в каждой шутке есть только доля шутки. Она думала: а вот наберусь наглости, позвоню и скажу что-нибудь эдакое...

Рабочий день закончился, но она не уходила, словно чего-то ждала. Он тоже не уходил, все на что-то надеясь. Но потом она нажала кнопку лифта, и уже собиралась спускаться пешком, как с лязгом распахнулись двери. Не поднимая глаз, она вошла. К ее руке кто-то легонько прикоснулся. Она подняла глаза. Это был он. Лифт уже давно стоял на первом этаже, а они все смотрели друг на друга и молчали. А зачем слова, если красноречивее глаз ничего не бывает?

ПРАЗДНИК БЕЗ ЛЮБВИ

В обеденный перерыв старший лейтенант, оперуполномоченный отдела уголовного розыска, купил шикарный букет роз. Сегодня он решил сделать предложение своей девушке. Его коллега капитан давно развелся с женой, и теперь у него много девушек. Капитан распланировал время так, чтобы хватило на всех подружек.

Сразу после обеда задержали одного разбойника. А тот возьми и расскажи, где прячется второй. В семнадцать часов они доложили об этом начальству. И закрутилось: начали созваниваться с райцентром, где прячется бандит, приняли решение выезжать на место... Подполковник предлагал ехать поездом: на улице гололед. "А куда потом с ним? Поедем на машине".

Подполковник дымил трубкой в своем большом кабинете. Радовался техническому прогрессу: милицейские рации не покрывают связью такую территорию, как "Velcom". И хорошо, что можно позвонить ребятам на мобильник и узнать, как они едут.

Подполковнику, конечно, было кого поздравить с праздником влюбленных. Но он остался на работе. Снова звонил на мобильник: "Ребята, не молчите, говорите, как дорога?". Прошло несколько часов. Придремавшего подполковника разбудил звонок по мобильнику: "Мы его взяли".

Был третий час ночи. Подполковник пожал операм руки, разрешил завтра до обеда отдыхать. Старший лейтенант в восемь утра с розами ожидал свою девушку у университета. Она сказала, что ей не нужен такой муж, если уже сейчас он не может быть с ней даже в праздник. Все девушки были с ребятами, и только она — одна. И розы его не нужны... Опер поехал на работу, а цветы подарил уборщице в управлении.

О. ЯНОВСКАЯ,
специально для "БМ"

Сага “Старога Ольсы”

З добра інфармаваных крыніцаў стала вядома, што гурт сярэднявечнай музыкі “Стары Ольса” патроху запісвае новы эпахальны праект. Хутка ці не, але мы зможам пачуць амаль што эпічную сагу. У альбом запісваюцца арыгінальныя вершы “Песні пра зубра” Міколы Гусоўскага ды “Слова пра паход гаравы”. Зразумела ж, усё гэта пад музыку старажытных інструментаў.

Пра планы, новыя праекты ды праблемы, з гэтым звязаныя, мы паразмаўлялі з лідэрам і ідэйным кіраўніком (нават, можна сказаць, “дыктатарам”) “Старога Ольсы” Зміцерам Сасноўскім. Сасноўскі — ад сябе заўважу — цікавы чалавек. У ягоныя маналогі нейкія пытанні ўстаўляць бессэнсоўна. Усе роўна так маляўніча, як ён расказвае сам, не атрымаецца.

НОВЫ ПРАЕКТ

Я ў арыгінале першы раз чытаў “Песню пра зубра” — зразумець не мог. Дзе там рытм і рыфма, дзе там вершы? Проста нейкая проза. Аказваецца, трэба было расставіць усё па познерымскай традыцыі, як вершы чыталіся — толькі пасля гэтага нешта атрымалася. І наш кансультант па артыстызму — Андрэй Андрэевіч Каляда, народны артыст, сказаў, што з першага дублю ўжо класна і на запісу ўсё можна пакідаць так, як ёсць. Праўда, колькі ён дыфірамбаў гэтай “Песне пра зубра” спяваў, настолькі ж ён “апускаў” той варыянт, у якім выканана “Слова пра паход Ігаравы”.

Зараз мы апрацоўваем кампазіцыі з першага альбому — каб іх можна было прэзентаваць на фестывалях гэтым летам. Лепш за ўсё пакуль атрымалася кампазіцыйна два творы — “Там, за халмом” і “Брама”. Першы навагрудскі фестываль паказаў ужо, што мы мала працавалі над кампазіцыямі.

Не тое, што “мала працавалі”. Калі ў Навагрудку гралі на двух канцэртах, нам падалося, што замала танцавальнай рытмікі. Здаецца, кампазіцыі вясёлыя, нармальныя, танцавальныя, але... Мы зараз працуем, разы ў чатыры павялічылі і ўскладнілі кампазіцыі, але каб яны былі годныя для Навагрудскага фестывалю. Ужо вядуцца перамовы пра наш выступ і шмат усялякіх іншых прапановаў выступіць — дзеля якіх танцавальныя праграмы і патрэбныя. У прыватнасці, даўно ідзе размова пра сярэднявечную дыскатэку — як яна гралася ў Навагрудку.



Мінулым летам у Польшчы быў Грунвальдскі фестываль, штогадовы. Усе гурты, якія там выходзілі — мы абменьваліся дыскамі — у іх вельмі шмат павольных кампазіцый. Але яны прывезлі толькі хуткую музыку, яе і гралі на сцэне. Увесь лагер бясіўся. Гэта проста патрабаванне такое — каб сярэднявечная музыка, на сярэднявечных інструментах, але хуткая і завадная. Таму зараз ідзе праца над тым, каб зрабіць танцавальную праграму — бо народу гэта падабаецца.

ІНСТРУМЕНТЫ

Вялікае патрабаванне — каб інструменты былі аўтэнтычныя. Мы набылі сапраўдную лютню, зробленую па італьянскай тэхналогіі, нават калкі там зроблены, як у Сярэднявеччы. Нарадзе — гудок, ці смык, як яго інакш называюць, — старажытнарускі інструмент, які ў канцы Сярэднявечча ўвогуле знік. Гэта прататып скрыпкі, на якой гралі вертыкальна, як на віяланчэлі. Прыгожы інструмент, які зараз амаль зроблены. Я хачу зрабіць басавы тамбур, які быў распаўсюджаны ва ўсіх народах у Сярэднявеччы — гэта басавы інструмент, у якога дзвератры струны і грыф. Адмыслова для таго, каб нам перадаваць бас, але не выносіць на сцэну бас-гітару. Мы з жахлівым поспехам з’ездзілі ў краму “Музыка”, каб замовіць гітару са звуказдымальнікам, але прышлі да высновы, што набываем чатыры п’езадатчыкі, каб агучваць мандаліну, гітару, лютню і тамбур, якога пакуль няма.

ЗАПІС

Запісваемся ў Гомелі ў прыватнай студыі. Па-першае, яна танней ды па якасці не саступае нікому. Дыскі два, якія выйшлі — былі запісаныя менавіта там. Па-другое, гукааператар, які робіць ужо трэці запіс з намі — да яго можна прыслухоўвацца. Ён ужо разумее, што рабіць, сам падказвае, дзе, як... Тое ж самае, як і мастак-дызайнер, фатограф, якія рабілі фотаздымкі ды вокладку да альбомаў, гукааператар на “Каўчэгу”, які робіць мастэрынг — яны ад дыску да дыску тыя ж. Яны захоўваюць стыль. Праўда, у другім альбоме стыль не вельмі захаваўся, бо мы ўключылі туды і клубныя запісы, далучылі да працы DJ, удзельнічалі іншыя гурты... Там чаго толькі няма! Здаецца, усе формы сярэднявечнай музыкі.

Зараз складаная сітуацыя з беларускім прадзюсаваннем. Справа ў тым, што ўсе бачаць канкурэнцыю. Калі мы выступаем у адных — сварымся з іншымі. З-за гэтага — канкрэтныя праблемы. Прыходзіцца выбіраць — ці то выступаць на “Белым замку”, ці то разлічваць на іншыя выступы і супрацоўнічаць з іншымі. Не будзем называць гэтых прадзюсэраў пайменна, прозвішчы называць — яны людзі і так вельмі вядомыя...

КАНЦЭРТЫ

21 сакавіка ў нас сольны канцэрт у Тэатры эстрады. Дарэчы, там збіраецца вельмі няслабая каманда. Гурт “Край” з Бабруйска — яны аранжыруюць фольк — захацеў выступіць разам. Здаецца, яны няблага граюць — толькі трэба паехаць і выбраць рэпертуар. Тут недзе побач сядзіць каскадзёрская група, з якой мы супрацоўнічаем — яны будуць біцца на сцэне, паказваць рыцарскія баі. Есць гурт “Майстат”, які арганізоўвае Арына Вячорка — яны будуць танцаваць сярэднявечныя танцы. 2 красавіка ёсць у плане Акадэмічны Тэатр Янкі Купалы, будзем выступаць разам з гуртом “Крэсіва” — яны першае аддзяленне, мы — другое. 2 чэрвеня будзе наш сольны канцэрт у тым жа тэатры Янкі Купалы. Ёсць і іншыя планы, пра якія распавядаць пакуль не буду.

Запісаў
Сяргей Пульша, “БМ”

P.S. ***І апошняе. Здаецца, “Стары Ольса” хутка стане манапалістам на сцэне старажытнай музыкі Беларусі. Два гурты, якія гралі падобную музыку, ужо амаль не існуюць — бо музыкі сышлі з іх менавіта ў “Ольсу”. Тэндэнцыя, аднак...***

Замочым аўтарытэтаў!

У адказ на неспадзяванае “паўстанне з заду” пахаванай год таму Рок-каранацыі, аргкамітэт альтэрнатыўнага фестывалю “Рок-гільятына” тэрмінова выдаў свой “Мані-квест”. Нечакана нават для саміх сябе арганізатары палічылі справай гонару працягнуць эўтаназію беларускага року з мэтай ачышчэння ягоных шэрагаў ад прывідаў і зомбі.

Пакуль яшчэ няясна, дзе і ў якіх умовах усё пройдзе, але тое, што і ў гэтым годзе будуць публічна названыя ахвяры беларускага шоу-бізнэсу — бясспрэчна.

Галасаваць можна як заўжды — анкетамі (форма прыкладаецца), а таксама на сайце гіл-тут-бу. Як і ў мінулым годзе, кола журы не абмежаванае — удзел прымаюць усе слухачы, а не “пантэон абраных” .

У мінулым годзе акцыя развянчання аўтарытэтаў папярэднічала “Каранацыі”, гэтым жа разам усё наадварот — галасаванне па кандыдатурах горшых толькі пачнецца пасля абвяшчэння афіцыйных лепшых.

”Калі лічыць, што “Каранацыя” выкопвае музычныя трупы, то “Гільятына” займаецца экзарцызмам”, — адзначаецца ў “Мані-квесце”.

Варта зазначыць двухэтапнасць падвядзення вынікаў — пасля сціслага па часе рэйтынгавага галасавання на плебісцыт будуць выстаўленыя спісы кандыдатур. Што тычыць фармату канчатковага абвяшчэння вынікаў — дакладна яшчэ нічога не вядома. У фінансавых пытаннях арганізатары гатовыя прадацца каму заўгодна, абы зрабіць канчатковае мерапрыемства відовішчным і незабыўным. Адным з асноўных грошадаўцаў гільятынатары не саромеюцца бачыць нават фундатараў “Каранацыі” — па прынцыпе “ім дробязь — нам прыемна”.

Зрух тэрмінаў мае яшчэ адно хітрае значэнне — як і ў мінулым годзе арганізатары маюць намер прыцягнуць на сваю імпрэзу абсалютна ўсіх удзельнікаў і лаўрэатаў рок-каранацыі. Тыя, хто на ўласнае гільятынаванне не з’явяцца, будуць падвергнутыя завочнаму тыканню іголкамі ва ўсе жыццёва важныя органы (вушы, язык і гэтак далей), каб не дапусціць удзелу ўсіх гэтых каранаваных намінантаў у далейшых каранацыях. Па непадцверджаных дадзеных, працэс гільятынавання будзе трансляваецца ў рэалтайм рэжыме па беларускім тэлебачанні і на сайце гіл-тут-бу.

Трэба адзначыць, што Рок-гільятына мае містычны ўплыў на лёс сваіх намінантаў — напрыклад, гільятынаваны ў намінацыі “незапісаны альбом” гурт “Сонца Мао” у гэтым годзе ўвогуле самаліквідаваўся. А намінант “за горшы альбом году” N.R.M. не запісаў новай праграмы ўвогуле . Тое самае здарылася і з “безнадзейнасцю 2000 году” гуртом ZET.

САМАЕ ГАЛОЎНАЕ: АХВЯРЫ МАЮЦЬ ШАНЕЦ ЗАСТАЦЦА НЕГІЛЬЯТЫНАВАНЫМІ, КАЛІ Ў ІХ ХОПІЦЬ ГРОШАЙ АДКУПІЦЦА. ПРАПАНОВЫ РАЗГЛЯДАЮЦЦА ПАСТАЯННА.

АнкеТа для ўсенАроднаГа галАсаВання

1. Татальны адстой (Горшы гурт году)
____
2. Самы правальны альбом
____
3. Самая адстойная песьня
____
4. Самы адмарожаны тэкст
____
5. Самы паганы кліп
____
6. Закрыццё году
____

Прапануй сваю намінацыю
____

Анкеты дасылайце на e-mail: sanitar@tut.by ці на адрас рэдакцыі “БМ”. Кожны голас будзе ўлічаны!

На днях выйдет сборник экстремальной музыки “Затерянный мир”

Как легко понять из названия, в компиляцию войдут команды, участвовавшие в любимых народом “Затерянных мирах” — в живом фестивальном или радио FM-формате. Среди них: REVELATION, BARRACUDA, SHITFUN, INFESTUM, SANATENA, HERETIC, MEDEVIL, DROMOS, ЗЬНІЧ и др. По словам Влада Бубена, эту метал-сборку от предыдущих, выпущенных в Беларуси, отличает ее действительно андеграундная направленность. Здесь вы не найдете притянутых за уши ради пущей раскупаемости компакта метал-зорак, отсутствуют также какие-либо искусственные ограничения.

Ожидается, что в недалеком будущем в одном из минских клубов состоится и презентация сборника.

Падарожжы з хобітамі

Фільм Пітэра Джэксана “Уладар кольцаў” стаўся сапраўдным хітом у Амэрыцы ды Эўропе. Ён праходзіць па 13 намінацыях на прэстыжную ўзнагароду “Оскар” і займае верхнія радкі па касавых зборах у кінатэатрах сьвету. На Беларусі фільм зьявіцца крыху пазьней, але ўжо сёньня вялікая колькасьць людзей уважліва сочыць за падзеямі вакол яго.



Кіно атрымалася. У ім ёсьць сапраўдныя жарсьці, сапраўдныя эмоцыі, а таксама адчувальная прысутнасьць зла — тое, чаго няма ў іншых сучасных стужках пра цуды ды чараўнікоў. Энэргічны, хуткі фільм рэжысэра Пітэра Джэксана рызыкоўна спалучае ў сабе супрацьлегласьці — шчырасьць і годнасьць разам з жорсткасьцю й нянавісьцю. Героі глядзяць у вочы адно аднаму й прысягаюць на квазішэкспіраўскай мове; і каб не пераканальнасьць, зь якой яны гэта робяць, такія словы падаліся б сьмешнымі.

Гісторыя стварэньня стужкі сама нагадвае прыгоду: паўтары гады на скалістых берагах Новай Зэляндыі ды непрадказальнае надвор’е зрабілі тое, што дагэтуль не ўдавалася яшчэ нікому — адначасовыя здымкі адразу трох сэрыяў. Вынік сапраўды ўражвае. Дзівішся таму, як дакладна Пітэр Джэксан перанес мастацкае бачаньне Толкіена — аўтара кнігі, па якой была зьнятая стужка, — на экран. Неабходныя ў такіх выпадках зьмены не пазбаўляюць гледача пачуцьця цуда й захапленьня. Увогуле, фільм атрымаўся вельмі блізкі да кнігі, а некаторыя дыялёгі практычна цалкам былі ўзятыя зь яе старонак.

Пасьля цёмнага й змрочнага пралогу, дзе тлумачыцца гісторыя чароўнага кальца, гледачы сустракаюцца з галоўным героем, якога клічуць Фрода (Элiджа Вуд), і ягоным мудрым гідам, чараўніком Гэндальфам (Іан МакКэлен). Гэта адбываецца ў невялічкім вясковым паселішчы пад назваю Хабітон. Першыя паўгадзіны фільму па-сапраўднаму кранаюць: здаецца, што вы перанесьліся ў горад эпохі Адраджэньня, дзе паўсюль жывуць невысокія добрыя хобіты. 111-гадовы Більба Бэгінс (Іан Холм), які валодае чароўным кальцом Сорана, перадае яго Фрода й тым самым несьвядома падвяргае жыцьцё хлопца небясьпецы.

Казка Толкіена здаецца вельмі простай і адначасова інтрыгуе: дзеля таго, каб уратаваць сьвет ад зла, Фрода мусіць вярнуць кальцо на Гару Гібелі — месца, адкуль яно было скрадзенае, бо толькі там магчыма зьнішчыць яго. Каб зрабіць гэта, Фрода павінен сфармаваць хаўрус паміж рознымі істотамі, што насяляюць Сярэднюю зямлю — эльфамі, карлікамі, хобітамі, чараўнікамі ды людзьмі — каб разам перамагчы армію Цёмнага Уладара (ці не нагадвае вам гэта сёньняшнія падзеі ў сьвеце? Калі так — то гэта надае фільму яшчэ большую актуальнасьць). І вось, разам з дзевяцьцю суродзічамі — Брацтвам — Фрода адпраўляецца ў зямлю Мордара.

Уяўленьне Джэксана разыгрываецца, калі гаворка заходзіць пра зло. Тыя, хто бачыў ягоныя чорныя камэдыі “Жывыя мерцьвякі” (“Dead Alive”) альбо “Нябесныя істоты” (“Heavenly Creatures”) могуць гэта пацьвердзіць. У хуткім часе на экране зьяўляюцца оркі са страшнымі тварамі, змрочныя ваяры ды пячорныя тролі з шахтаў Морыя. Вы нават амаль адчуваеце пах цёмнага вільготнага лесу.

Гэта жорсткае кіно — асабліва жорсткае для дзяцей, бо часам там прысутнічаюць моманты, якія больш нагадваюць “Матрыцу”, чым Сярэднявечча. Аднак, дзякуючы клясычным прыёмам, мы перажываем за герояў з такой глыбінёй пачуцьцяў, што потым гэта падаецца надта дзіўным. У адрозьненьне ад іншых сучасных стужак у стылі “экшн”, гэты фільм не проста забаўка — ён выклікае ў гледача жаданьне пабачыць працяг і проста падумаць.

Ян Мацур, для «БМ»
(Захаваны правапіс арыгіналу)

На этой неделе Белорусская молодежная организация "Новые лица" отметила свой первый маленький юбилей — пять лет. Главное, для чего создавалась организация, — поддержка начинания молодых и инициативных во всех сферах нашей жизни, содействовать развитию волонтерского движения, наладить международные молодежные обмены.

За этот небольшой, в общем-то, срок организация разработала и реализовала массу интересных проектов. Среди них — создание детского центра для подростков из неблагополучных семей "Поможем им найти себя!", проведение серии семинаров по проблемам ВИЧ/СПИД. Творческая молодежь смогла реализовать свои амбиции, участвуя в театральных постановках о проблемах современного молодого поколения на сценах Беларуси, Англии и т.д. На следующую пятилетку своей деятельности организация "Новые лица" планирует проведение акций и мероприятий не менее интересных и значимых. Первой акцией станет экологический проект "Нам здесь жить!". Принять участие в нем может каждый желающий житель столицы. В рамках этой акции будет благоустроен, очищен от мусора и кострищ, превращающийся практически в городскую свалку парк-музей валунов в Уручье.

"Новые лица" в городе

Желающие присоединиться к облагораживанию родного города, а также наладить долгосрочное сотрудничество с объединением "Новые лица", могут обращаться за информацией в офис организации по адресу: г. Минск, ул. Варвашени, 17-600. Тел.: 284-73-65.

Контактные лица: Юркевич Светлана, Дудина Анастасия.

Соб. инф.

Таварыш маёр, пакінь пачытаць...

Шкада, калі на прылаўках "Белсаюздруку" вы не паспелі набыць беларускі праект журналісцкіх даследванняў — "БДГ для служебного пользования". Але справу яшчэ можна выправіць

Пытанне, канешне: для чыйго службовага карыстання? Логіка падказвае, што ў першую чаргу службова скарыстаць матэрыялы цікавай газеты мусяць "таварышы маёры" з адпаведных ворганаў і чыноўнікі з Міністэрства інфармацыі. Апошнія змарнуюць шмат працоўнага часу, шукаючы юрыдычныя зачэпкі для "накату" на выданне — іх, на першы, другі і трэці погляд, няма. А між справай "вертыкальныя" могуць атрымаць масу задавальнення, чытаючы аб жыцці сваякоў прэзідэнта ў вёсцы Александрыя...

Напрыклад, такое: "Двоюродный брат президента — холостяк средних лет. Живет во второй Александрии с мамой. Как меня проинструктировали милейшие люди, соседи Геннадия, если будет трезвым — поговорите, если нет — лучше сразу уходи... В соответствии с данной мне инструкцией я поспешил удалиться..."

Для службовага карыстання газету варта набыць і Міністэрству абароны. А вось салдатам газету чытаць, напэўна, не дадуць. Таму што яны даведаюцца шмат цікавага аб колькасці генералаў у родным войску, як галоўным выніку вайсковай рэформы.

Скарыстаць па службе газеціну могуць і міліцыянты — ім цікава будзе пачытаць аб жыцці і кар'ерах беларускіх "вароў у законе", або (на выбар) аб творчым шляху роднага міністра. Гаішнікам увогуле варта раздаваць нумар паймення — каб, стоячы на пастах, чыталі і не бачылі, як праносяцца міма міністэрскія машыны. Тыя, што, паводле "ДСП", могуць аказацца "палёнымі" і знаходзіцца ў міжнародным вышуку.

У няўдалых укладнікаў "Белбалты" служба адна — хадзіць па інстанцыях ды часам стаяць у пікетах. Тут і дапаможа газета, якая падрабязна распавядае, дзе шукаць грошы — прыкладна там жа, дзе і вецер у полі... А калі чарга да чыноўніка доўгая — можна яшчэ паспець даведацца і пра тое, як нашы дыпламаты канфузяцца на афіцыйных прыёмах. А таксама знайсці расповяды пра барацьбу з КДБ савецкіх (і антысавецкіх) рок-музыкаў, пра першы ў Саюзе рок-гурт, які склалі маёрскія антысаветчыкі, і пра біяграфію рэжысёра Лук'янчыкава, удзел у якой прыняў сталінскі кат.

Ясная справа: на службе газету пачытаюць і працоўныя трактарнага заводу. Калі на прадпрыемстве ў чарговы раз здараецца прастой, можна марнаваць час, чытаючы пра свайго "пасажонага дырэктара". Праўда, адна акалічнасць — 700 рублёў не кожны працаўнік знойдзе, калі толькі не "зэканоміць" іх на прафсаюзных унёсках...

Затое ў беларускіх праграмістаў грошы ёсць. І, адарваўшыся ад кампутара, яны могуць пачытаць "ДСП", ды ў чарговы раз даведацца аб тым, што працуюць яны на заходняга дзядзьку за грошы, якія тут лічацца нядрэнным заробкам. У прынцыпе, праграмісты ведаюць гэта і самі, затое беларуская прэса пра афшорнае праграмаванне піша зрэдку. А дарма — адзіная галіна айчыннай эканомікі, якая стала прыносіць грошы, хай сабе і ў якасці краіны "трэцяга свету".

Карацей, вось такое яно — нашае жыццё праз прызму беларускага "Совершенно секретно". Не падабаецца? Выпраўляць трэба... А газетка файная!

Калі ж у "Белсаюздруку" ужо ўсё размялі — звяртайцеся на "сакрэтны" адрас: вул. Інтэрнацыянальная, 11а, шапік УП "Марат". Там адназначна ёсць.

Упаўнаважаны па газетах

• ВАМвыдат

Люты-каляндар

(Заканчэнне. Пачатак у № 6)

• 18 ЛЮТАГА

18 лютага 1893 году нарадзіўся найбуйнейшы беларускі пісьменьнік і навукоўца XX ст. Максім Гарэцкі. Друкавацца ён пачаў яшчэ ў 1912 годзе ў віленскай "Нашай Ніве", таксама ў Вільні праз два гады выйшаў ягоны першы зборнік апавяданьняў "Рунь". Гарэцкі быў вы-кладчыкам літаратуры ў Віленскай беларускай гімназіі й напісаў першы падручнік гісторыі беларускай літаратуры.

• 19 ЛЮТАГА

19 лютага 1908 году нарадзіўся беларускі паэт Станіслаў Шушкевіч. Ён найлепей вядомы як аўтар вершаў для дзяцей. А яшчэ вядомы сваім сынам — Станіславам Шушкевічам, кіраўніком Беларусі, за якім краіна набыла незалежнасьць.

Наступная дата звязаная з папярэднім абвешчаньнем незалежнасьці Беларусі. **19 лютага 1918 году** ў Менску выканаўчы камітэт Усебеларускага зьезду стварыў Народны сакратарыят — часовы ўрад Беларускай Народнай Рэспублікі. Пазьней Народны сакратарыят быў перайменаваны ў Раду Беларускай Народнай Рэспублікі. Узначальваў сакратарыят Язэп Варонка. А сёньняшнюю Раду ачольвае Івонка Сурвілла, якая жыве ў Канадзе.

• 20 ЛЮТАГА

20 лютага 1918 году выдадзеная Першая ўстаўная грамата да народаў Беларусі. Гэты юрыдычны й палітычны акт быў прыняты Выканаўчым камітэтам Рады Ўсебеларускага Зьезду. Першая ўстаўная грамата яшчэ не абвяшчала Беларусь самастойнай дзяржавай. Беларусі надаваўся статус аўтаноміі з рэспубліканскім ладам у складзе Расейскай дэмакратычнай рэспублікі. Канчатковая незалежнасьць Беларусі будзе абвешчаная Трэцяй устаўной граматай 25 сакавіка 1918 году.

• 28 ЛЮТАГА

У гэты дзень, **28 лютага 1468 году**, больш за 500 гадоў таму, у дзяржаве нашых продкаў — Вялікім Княстве Літоўскім — прымаецца першы крымінальны кодэкс, так званы Судзебнік, які яшчэ называюць Статутам Казіміра. Напісаны ён быў на старабеларускай мове й спарадкаваў усе віды злачынстваў і пакараньняў. Пры гэтым Судзебнік захоўваў нормы звычаёвага права.

І яшчэ адна дата са старой беларускай гісторыі. **28 лютага 1768 году** была створаная Барская канфэдэрацыя. Гэта акурат у тыя часы, калі Расейская імпэрыя пачынала часткамі захопліваць аслаблае Вялікае Княства Літоўскае. Барская канфэдэрацыя ўяўляла сабою аб'яднаньне шляхты, дзеячоў царквы й кіраўніцтва дзяржавы для барацьбы супраць уплыву Расеі на каралеўскі ўрад, а таксама дзеля захаваньня шляхецкіх вольнасьцяў.

• 29 ЛЮТАГА

29 лютага бывае толькі раз на чатыры гады.

29 лютага 1872 году нарадзіўся беларускі мастак Вітальд Бялыніцкі-Біруля, аўтар тонкіх жывапісных краявідаў. Пісьменьніца Ядвіга Бяганская таксама прыйшла на сьвет **29 лютага — у 1908 годзе**. Цікава, як гэтыя людзі адзначалі дні свайго нараджэньня? Хіба кожны чацьверты год, ці пераносілі на 28-га?

Падрыхтаваў Ян МАЦУР,
студэнцкая
газета «Анціпод»
Крыніца: www.vilnia.com

Мастацтва, што падорыць надзею

З 15 лютага па 2 сакавіка ў «Галерэі мастацтваў» працуе выстава пад назвай «Не праходзьце міма», «бацькамі» якой з'яўляюцца Людміла Шчамлёва і Ігар Рымашэўскі.

Асноўная тэма выставы — навакольнае асяроддзе, стаўленне да якога тут вызначаецца з адмысловым пачуццём гумару.

Шмат якія творы аўтабіяграфічныя. Яны — як прыступка для мастакоў да разумення свайго «Я» у грамадстве і наваколлі.

Ігар і Людміла, натхнёныя подыхам вясны, у недалёкай будучыні збіраюцца наладзіць выставы ў Германіі і Расіі.

Калі вы не прызнаеце законы логікі і марыце патрапіць у казку «аб двух сусветах», дзе дробязі становяцца лагічнымі, а немагчымае — існуе, як дадзенае, то гэтая выстава для вас. Спяшайцеся!



"Беларуская маладзёжная"
Рэспубліканская грамадска-палітычная незалежная газета
Заснавальнік
Рэдакцыя газеты "Беларуская маладзёжная"
Рэдакцыйная калегія: А. Г. Пятроўская — загадчык аддзела інфармацыі, І.А. Слаўнікава — загадчык аддзела па сувязях з дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі.

Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў, друкаваць артыкулы дзеля палемікі

Адрас рэдакцыі:
220134, Мінск,
вул. Якубоўская, 15-1-77
Кантактныя тэлефоны: 57-00-43, 20-98-04
E-mail:belmol@irex.minsk.by
Пасведчанне аб рэгістрацыі № 665
Пры перадруку спасылка на "БМ" абавязковая

Падпісана ў друк 21 лютага 2002 г. у 14.30
Надрукавана з дыяпазітываў заказчыка ў паліграфічным РУП "Чырвоная звязда", 220073, г. Мінск, Першы Загарадны завулак, 3.
Кошт свабодны
Тыраж 3000 экз. Заказ № 1655

Галоўны рэдактар
Т.І. Мельнічук
(Нічыпарук)

Падпісны індэкс
63309